**Заданні да конкурсу “Знак таленту”**
**25.04.2024**

**Тэма: “Аповесць Максім Гарэцкага “Дзве душы” як крок да станаўлення беларускай нацыянальнай літаратуры і філасофіі”**

## Заданне 1
**Прачытайце факты з біяграфій пісьменнікаў і вызначце, пра каго ідзе гаворка.**

1. Выкладаў у Віленскай гімназіі.
2. Вучыўся ў Віленскім рэальным вучылішчы.
3. Служыў у войску, трапіў на фронт.
4. На вайне быў у званні прапаршчыка.
5. Аўтар зборнікаў “Жалейка”, “Гусляр”.
6. Піша кнігу “Гісторыя беларускай літаратуры”.
7. Карыстаецца жаночым псеўданімам.
8. Піша пад псеўданімам Яська-гаспадар з-пад Вільні.
9. Хварэе на сухоты.
10. Праходзіць лячэнне ў прыватным яўрэйскім шпіталі Мішмэрэс-Хойлін.
11. Сын праваслаўнага святара.
12. Вучыцца ў царкоўна-прыхадской школе.
13. Рэдактар газеты “Наша думка”.
14. Друкуецца ў газеце “Наша думка”.
15. Уваходзіць у склад Інбелкульта.
16. Працуе ў Віленскім саюзе каапературываў.
17. Аб’ектам даследвання абірае беларускі светагляд.
18. Быў арышт аваны чатыры разы.
19. Расстраляны савецкай уладай за контррэвалюцыю.
20. Скончыў жыццё самагубствам.

## Заданне 2
**Паглядзіце на фотаздымкі. Адкажыце на пытанні да іх.**

**1.** Запішыце прозвішчы, імёны, імёны па бацьку людзей, якія выяўлены на фотаздымках. Таксама запішыце іх псеўданімы.

**А)** 

**Б)** 

**Паглядзіце на фотаздымкі. Адкажыце на пытанні да іх.**

**2.** Дзе размяшчаюцца або размяшчаліся аб’екты, што выяўлены на фота?

А) 

Б) 

**Паглядзіце на малюнкі і фотаздымкі. Адкажыце на пытанні да іх.**

**3.** А) Як называецца кніга, хто яе аўтар?

Б) Хто аўтар тэксту, надрукаванага ў газеце, як ён называецца?

В) Хто аўтар гэтага тэксту, як ён называецца, у якім годзе выдадзены?

**А)** 


**Б)** 

Цана асобнага нумэру 5 кап.

НАША НІВА

Выходзіць што тыдзень.

Год VIII. 25 студня 1913 г. № 4.

**В)** 


**Паглядзіце на фотаздымкі. Адкажыце на пытанні да іх.**

**4.** Хто на фотакартках? У якія перыяды жыцця і ў якіх абставінах маглі быць зроблены гэтыя фотаздымкі? Дайце як мага больш разгорнуты адказ.

А) 

Б) 

**Паглядзіце на фотаздымкі. Адкажыце на пытанні да іх.**

**5.** Ніжэй прадстаўлены фота са спектакля па аповесці Максіма Гарэцкага “Дзве душы”. Запішыце, у якім годзе была зроблена гэтая пастаноўка, якім тэатрам, хто быў рэжысёрам.




У красавіку **2016** года ў **Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы** адбылася прэм'ера спектакля «Дзве душы» паводле аповесці Максіма Гарэцкага ў пастаноўцы **Мікалая Пінігіна.**

**Заданне 3.**

**Частка А. Пазнайце героя аповесці па апісанні, запішыце яго ці яе імя.**

| | |
|---|---|
| **1.** …не пазнаваў даўнейшага …, неклапатлівага, вясёла-няўважнага пастуха, потым работніка ў прудзе (млыну). У яго на вачох быў сур'ёзны, удумлівы, крыхачку хмарны работнік, каторы найлепі разважаў аб значэнні падзей і быў гарачы паклоннік недалёчкай сацыяльнай рэвалюцыі. | |
| **2**. …аратар – малады яшчэ хлапец, вучань Гарэцкага каморна-агранаміцкага вучылішча…аратар гэты, стоячы на плоце і абшчапіўшы аднэй рукою кол, другою, змёрзлаю, грубаю і чырвонаю, быццам тая карэлая гліна, махаў у рытм прастуднага, сіплага, але маладога і дужога голасу… | |
| **3.** …меў такі характар, што што-небудзь незвычайнае ў жыцці не ўражала адразу душы яго болем і радасцю…ён доўгі час і ў гэтым разе быў толькі пабочным глядзельнікам і ціхім думаннікам. | |
| **4.** Але правадыры-інтэлегенты з іх характэрнай інстынктыўнай цямнасцю не мелі для яго асаблівай прыхільнасці. Чулі ў … той гатунак людзей-самавукаў, каторыя хоць і вялікай высакосці даходзяць у мастацтве, палітыцы ці абы-якой навуцы, але назаўсёды застаюцца з нейкай хібаю ў самым грунтоўным, а дзеля таго неўспадзеўкі і страшна лёгка зваліваюцца часам на самы дол чалавечай думкі. Яны, гэтакія, нейкім дзівам сумяшчаюць у душы сваёй найлепшы, здаецца, гуманізм і найгоршае, акажацца, чалавеканялюбства, хімію і алхімію, марксізм і хірамантыю і з аднолькавай шчырасцю веруюць у тое і другое. | |
| **5.** Яна ж зморана схілілася і паглядзелася ў люстра; і паціху адсунулась; схудзела і неяк зблажэла за гэтыя дні беганіны і непакою ў незвычайнай сферы. Дзівавала сабе, што згубіла і не мае сваёй паўсёднай жыццярадаснасці, што выбілася з духу. | |
| **6.** …грэбліва маўклівы, панскае пароды гвардзейскі афіцэр. | |
| **7.** Памешчык сярэдняй заможнасці…атупеў з гора і злабы… | |
| **8.** Белы тварык з бліскучымі чорнымі вачмі і пасмачкамі; а ў тых вачох радасна-вясёлы, ціхі смех… летуцела быць балерынаю, танцавала многа і з вялікай прыемнасцю | |
| **9.** Пад прозвішчам … працаваў у месце N., сярод бальшавікоў капітан …, як тайны агент вялікага маскоўскага хаўрусу «Вызвалення Расеі».<br>Гэта быў высокі мужчына ў чорным крытым кажушку і вялікіх, халявістых ботах, яшчэ не стары, але з акладзістаю барадою і сівеючай галавой, быццам усаджанай у вялікія чорныя акуляры. | |

| | |
|---|---|
| **10.** …была ціхая, маўклівая, але разумная і рахманая баба, жонка здадзенага ў салдаты і ў скорым часе памёршага там мужыка, і прыйшлася якраз да новага жыцця. | |
| **11.** …пачуў, як зняцейку капнулі з вачэй слёзы, і мяніў сябе ў думках неўрастэнікам, і бязвініў, што гэта добра, што плачыць па без пары згасшаму песняру, і рад быў, што яны ў цямноце не бачаць яго слёз. | |

**Частка Б. Каму з герояў належаць наступныя словы аб беларусах і аб беларускім адраджэнні?**

| | |
|---|---|
| 1. - Ну, таварыш, дзёрнем за вашу самасційную мову і... за богам створанае характво, ці што... Не за харавство вашае мовы, не, бо яна, таварыш, пакуль што мала скобленая і некультурная… | |
| **2**. Браты сяляне! Браты беларусы! Значыцца, будзем галасаваць за свой спісак! За беларускі спісак!<br>…А тут нічога не выйдзе, бо селяніну бліжэй і знаямей цяпер пытанне аб міры і зямлі, чымся аб беларускім адраджэнні. | |
| **3.** - У нас, белоруссов, нет классовой борьбы! - смачным, зычным голасам прагалашаў … у заканчальнай прамове. - Нет ее, не должно быть и не будет!! Мы все, от пана до Степана, как говорится, будем стоять за одно: тесный союз з Россией и законное наделение малоземельных крестьян землею!.. | |
| **4.** «Да ўніверсітэта гаварыў найбольш па-беларуску. І думаў па-беларуску. Не: школа навучыла думаць па-руску. Ці ж праўда?» І лавіў сябе, як думае: па-беларуску ці па-маскоўску, і не мог злавіць. «А вы, аднак жа, адкажыце мне...» Ён нічога не можа адказаць. Ён нават не можа адчуць усяе глыбі гора і няшчасця гэтай старонкі, што цяпер усцяж укрыта акопамі, крыжамі і магілкамі. Не можа. «А вы, аднак жа...»<br>- Я, бачыце, як беларус, патроху знаходжу сябе ў беларускай нацыянальнай і сацыяльнай свядомасці. | |
| **5.** ...думала так: для адраджэння патрэбны людзі з вышэйшай асветаю, дык яна папрацуець год-два ў школцы, заробіць грошы, а потым паедзе вучыцца.<br>…хацела вырваць з успамінаў тую вясну, назаўсёды зрачыся ўсякіх любошчаў і ўсёй душою аддацца “толькі аднэй святой працы - працы на ніве беларускага адраджэння”.<br>“Ці можна шкадаваць сіл, прыгажосці, маладосці для адраджэння бацькаўшчыны?” | |
| **6.** Яму здавалася, што ўсе рэнегаты-беларусы ведаюць аб адраджэнні і аб тым, што павінны адраджацца, і калі не адраджаюцца, дык з прычыны прыкрай людской нядбайнасці і папсаванасці сваей натуры.<br>…было дужа цяжка знасіць тое, што на тэрыторыі Беларусі ў бальшавізму, апрача чужынцоў, ачынуліся і ўзяліся кіраваць беларускім сялянствам якраз найгоршыя на іх погляд беларускія людзі, бо абмаскаленыя беларусы, закаранелыя рэнегаты і партыйна-тупыя праціўнікі “ўсякага там яшчэ адраджэння”, пагарджаўшыя, з іх убогай духоўна фанатычнасцю, беларускай моваю і ўсім нацыянальна-беларускім. | |

**Заданне 4.**

**Выберыце правільны адказ/адказы з прапанаваных.**

*Кожны правільны адказ –1 б., макс. 10 б.*

**1. Якія былі перадумовы ўзнікнення эсэ “Адвечным шляхам”?**

А. Фарміраванне ўласнай ідэнтычнасці беларускага народа;
Б. Імкненне да пабудовы незалежнай дзяржавы;
В. “Пераацэнка каштоўнасцей” і адмаўленне класічных падыходаў у мысленні;
Г. Палітычныя перавароты (рэвалюцыі 1905 і 1917 гадоў), Першая сусветная і грамадзянская война на Беларусі.

**2. Каму Ігнат Канчэўскі прысвяціў свой галоўны твор (“Адвечным шляхам”)?**

А. Любай жонцы Мілачцы;
Б. Бацьку Уладзіміру Ігнатавічу Канчэўскаму;
В. Брату Арсеню Канчэўскаму;
Г. Максіму Гарэцкаму.

**3. Што лучыць эсэ “Адвечным шляхам” з мастацкім творам?**

А. Метафарычнасць;
Б. Структурыраванасць тэсту;
В. Значная колькасць эмацыйна-афарбаванай лексікі;
Г. Асноўныя тэзісы, змешчаныя на пачатку кожнай з частак.

**4. На прыкладзе каго Канчэўскі паказвае дваістасць беларускай душы ў адносінах рэлігіі (зрабіўшыся хрысціянамі, беларусы не забыліся на сваіх паганскіх багоў)?**

А. Францыск Скарына;
Б. Рагнеда;
В. Усяслаў Чарадзей;
Г. Міндоўг.

**5. Якія ідэі прапануе Ігнат Канчэўскі для гарманічнага развіцця грамадства (у тым ліку беларускага), пазбягання духоўнага і сацыяльнага крызісу?**

А. Ідэя верхавенства “духа канцылярыі”;
Б. Ідэя “ліючайся” формы;
В. Ідэя творчасці як “жыццёвай падставы”;
Г. Ідэя “пластычнасці законаў”.

**6. Што Ігнат Канчэўскі называе “духовым мяшчанствам”?**

А. Ідэалогію;
Б. Творчасць;
В. Маральны кодэкс;
Г. Хрысціянства .

**7. Дапоўніце думку Ігната Канчэўскага: “Дух нацыянальны заўсёды мацнейшы і чысьцейшы ў народаў …”.**
А. вольных;
Б. прыгнечаных;
В. высокаразвітых;
Г. пануючых.

**8. Якую рэальную “грамаду”, дзе адсутнічае прымус, Ігнат Канчэўскі прыводзіць як прыклад свабоднага грамадства?**
А. Беларускіх старавераў;
Б. Яўрэйскую абшчыну (кагал);
В. Запарожскую Сечу;
Г. Савецкую камуну.

**9. Дапоўніце думку Ігната Канчэўскага : “разам з … мы трацім і лепшую частку чалавечнасьці”.**
А. мовай;
Б. свабодай;
В. дзяржаўнасцю;
Г. беларушчынай.

**10. Вершы каго з класікаў цытуюцца ў абодвух творах?**
А. Змітрака Бядулі;
Б. Максіма Багдановіча;
В. Янкі Купалы;
Г. Алеся Гаруна.

## Заданне 5

**Адкажыце на пытанні.**

**1.** Пералічыце гістарычныя перыяды, падзеі, адлюстраваныя ў аповесці “Дзве душы”(назвы і даты).
**2.** Назавіце накірункі палітыкі першых гадоў савецкай улады , што знайшлі адлюстраванне ў аповесці “Дзве душы”.
**3.** Арганізацыя і дзейнасць якіх органаў савецкай ўлады на вёсцы сталі прычынай шматлікіх паўстанняў сялян? У аповесці іх дзейнасць апісвалася наступным чынам: “паварочаліся дамоў гультаямі, бандытамі і пад штандарам бальшавізму здзекуюцца над усімі сялянамі”.
**4.** Па якім абвінавачванні Мікола Канцавы трапіў у “чразвычайку”?
**5.** Што Ігнат Абдзіраловіч у размове са студэнтам назваў сваёй Бацькаўшчынай?
**6.** Студэнт Сухавей ў адносінах да Абдзіраловіча выказаўся: “Ну, дык мне не па дарозе з рэнэгатам”. Растлумачце, хто такі рэнегат.
**7.** Кнігу менавіта гэтага аўтара, пачынаючы з якога “згасьлі вялікія жаданні і лятункі аб вольным чалавеку” (паводле Канчэўскага), са здзіўленнем знаходзіць Ігнат Абдзіраловіч на кватэры ў Васіля.
Запішыце назву кнігі і прозвішча яе аўтара.
**8.** Каму з персанажаў належаць словы: “сячы трэба да карэння”? Што яны азначаюць?
**9.** Чаму Ігнат Канчэўскі падпісвае сваё эсэ “Адвечным шляхам” псеўданімам Ігнат Абдзіраловіч?

**10.** Чаму, на думку Ігната Канчэўска, "беларускі народ не стварыў выразнай культуры"? Якая "вялікая трагедыя народнага духу" гэтаму перашкодзіла?
**11.** Прывядзіце прыклады з аповесці "Дзве душы", якія б падцвярджалі наступную цытату з эсэ "Адвечным шляхам":
"Марксізм лічыць магчымым даць уладу толькі пролетарыяту, ну, а сялянства павінна цярпець яго, хоць і «працоўную», дыктатуру. Знача, ўжо рабы і ўладары ёсьць; і прыклад камуністычнага досьледу Расеі сьведчыць, што працоўныя ўладары могуць быць вельмі жорсткія і несправядлівыя да сваіх працуючых рабоў."
**12.** Узгадайце адвечнае пытанне Шэкспіра: "Быць, або не быць?". Адкажыце за галоўнага героя аповесці "Дзве душы" , "быць або не быць кім?".

Напрыклад : *"Быць або не быць **чалавекам**"*